# Сцэнар экаквэста «Прырода Беларусі – нашчадкам»

***Сцэнарыст-складальнік:*** *Святлана Лукс, культарганізатар аддзела культурна-дасугавай дзейнасці ЦДАДіМ «Маяк» г.Мінска.*

***Удзельнікі:*** *выхаванцы летніх аздараўленчых лагераў.*

***Мэта:*** выхаванне экалагічнай культуры і экалагічнай граматы навучэнцаў праз арганізацыю гульнявой дзейнасці.

**Задачы:**

1. фарміраваць пазнавальную цікавасць і пазнавальную актыўнасць навучэнцаў;
2. фарміраваць у дзяцей камунікатыўныя ўменні, навыкі працы ў групе;
3. фарміраваць асаблівыя адносіны дзяцей да экалагічных праблем, выхоўваць беражлівыя, гуманныя адносіны да прыроды;
4. фарміраваць павагу і разуменне каштоўнасці нацыянальнай культуры і прыроды;
5. фарміраваць пазітыўнае станаўленне да народных традыцый і абрадаў.

**Тэхнічнае абсталяванне:** раздатачны матэрыял, папера, ручкі, таблічкі, рэквізіт да квэста, сцэнарная распрацоўка экалагічнага квэста, маршрутныя лісты, назвы маршрута, папкі для куратараў прыпынкаў, сталы, музычная апаратура, мікрафон для вядучай.

*(Экаквэст адбываецца на пляцоўцы каля клуба па месцы жыхарства «Ровесник». На пляцоўку да дзяцей выходзіць Васілінка і расказвае легенду, якая раскрывае сэнс квэста. Пасля гэтага дзеці атрымліваюць маршрутны ліст і адпраўляюцца выконваць заданні).*

*(Выхад Васілінкі)*

**Васілінка:** Добры дзень, сябры! Я, Васілінка, беларуская дзяўчынка! Здарылася бяда, і мне вельмі патрэбна ваша дапамога. Для таго, каб вы лепш зразумелі ўсю сур’ёзнасць сітуацыі, я распавяду вам старажытную легенду…

Амаль 200 гадоў таму на нашай чароўнай зямлі валадарылі цудоўныя і вельмі моцныя старажытныя багі і розныя міфічныя істоты. Усе яны жылі ў згодзе і гармоніі з чалавекам. Міфічныя істоты дапамагалі чалавеку ў хатніх справах, а чалавек дапамагаў істотам у іх міфічных рытуалах. Беларусы вельмі паважалі багоў, ушаноўвалі іх на разнастайных святах. Але самае галоўнае тое, што чалавек ахоўваў прыроду і зберагаў жывёл і расліны. За гэта багі былі вельмі ўдзячны чалавеку. А багіня Давія, якая адказвала за прыроду і ўсё жывое на беларускай зямлі, была тады самай моцнай. Але мінуў час… І чалавекам авалодаў тэхнічны прагрэс, усё больш і больш адбудоўваліся гарады, заводы, дарогі, і прырода адышла на другі план. Экалогія была сапсавана, з-за гэтага сталі знікаць расліны і жывёлы. Старажытныя багі вельмі раззлаваліся і адправілі на зямлю нячысцікаў, якія сталі вельмі моцна шкодзіць чалавеку ва ўсіх яго справах. І самае дрэннае тое, што беларусы сталі забываць свае нацыянальныя традыцыі і абрады.

Прыродзе трэба было дапамагаць, а багіня Давія з таго часу кожны дзень страчвала сваю чароўную сілу.

**Васілінка:** Вось такія справы, мае даражэнькія! І зараз, каб задобрыць багоў, трэба выканаць іх чароўныя заданні. Калі гэта зрабіць, то можна выратаваць нашу прыроду і культуру. А багіня Давія зноў стане самай моцнай багіняй у старажытным пантэоне. Скажыце, калі ласка, вы мне дапаможаце? *(Дзеці адказваюць).* Ох, вельмі добра! Зараз я вам ўсё растлумачу. Вось вашы карткі з заданнямі ад багоў, а вось там вы бачыце розныя прыпынкі і маіх памочнікаў. Вам трэба прайсці ўсе прыпынкі ў тым парадку, які вы бачыце на маршрутных лістах. За кожнае заданне вы атрымаеце чароўныя сімвалы, якія потым мы з вамі злучым разам і прачытаем выратавальны заклён для нашай прыроды. Зразумела? Тады мы пачынаем!

### 1. *Прыпынак «Чырвоная кніга»*

**Куратар прыпынка:** Прывітанне, сябры. Наш прыпынак называецца «Чырвоная кніга». Скажыце, калі ласка, што вы ведаеце пра Чырвоную кнігу? *(Дзеці адказваюць).* Вельмі добра! Вы вельмі разумныя дзеткі. Вы правільна разважаеце. Чырвоная кніга – гэта пералік рэдкіх відаў раслін і жывёл, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення, або зніклых жывёл, раслін і грыбоў. Нашы старажытныя багі падрыхтавалі для вас заданне. Для пачатку нам трэба выбраць 5 чалавек з атрада. Яны будуць выцягваць карткі, на якіх намаляваны жывёлы з Чырвонай кнігі. Затым вам трэба апісаць гэтую жывёлу так, каб ваша каманда адгадала яе. Але ёсць адно важнае правіла: нельга ўжываць аднакарэнныя словы!

*(Куратар прыпытка паказвае прыклад таго, як трэба тлумачыць. Затым дзеці выконваюць заданне).*

### 2. *Прыпынак «Кветкавы карагод»*

**Куратар прыпынка:** Вітаю вас, даражэнькія нашы выратавальнікі! Мой прыпынак мае назву «Кветкавы карагод». Скажыце, калі ласка, як кветкі ўплываюць на нашу экалогію? *(Дзеці адказваюць).* Так, верна. Кветкі і расліны вельмі спрыяльна ўплываюць на экалогію і навакольнае асяроддзе. У першую чаргу расліны – гэта наш кісларод, акрамя таго, гэта яшчэ і корм для нашых жывёл, ну і, безумоўна, кветкі – гэта цудоўны водар і прыгажосць… Маё заданне вельмі складанае. Старажытныя багі пераблыталі ўсе кветкі, і нам з вамі трэба суаднесці кветкі з іх назвамі *(паказвае кветкі і назвы)*.

 *анютины глазки*  *гладиолус*  *василёк*  *голубой*
*лён*  *дремлик тёмно-красный*  *календула*  *клевер* 
*ландыш*

 *колокольчик*  *куриная слепота*  *незабудка*  *ромашка*

 *пальцеголовник*  *подснежник*  *медуница лекарственная*

*Дзеці пад кіраўніцтвам куратара выконваюць заданне.*

**ВАСИЛЁК – *васілёк (валошка),***
**РОМАШКА – *рамонак,***
**КАЛЕНДУЛА – *календула,***
**ЛАНДЫШ – *ландыш,***
**ГЛАДИОЛУС – *гладыёлус,***
**КУРИНАЯ СЛЕПОТА – *курыная слепата,***
**НЕЗАБУДКА – *незабудка,***
**ДРЕМЛИК ТЕМНО-КРАСНЫЙ – *дрэмлік цёмна-чырвоны,***
**ПАЛЬЦЕГОЛОВНИК КРАСНЫЙ – *пальцагалоўнік чырвоны,***
**ГОЛУБОЙ ЛЁН – *блакітны лён,***
**МЕДУНИЦА ЛЕКАРСТВЕННАЯ – *медуніца лекавая,***
**ПОДСНЕЖНИК – *пралеска,***
**КЛЕВЕР ЛУГОВОЙ – *канюшына лугавая,***
**КОЛОКОЛЬЧИК – *званочак,***
**АНЮТИНЫ ГЛАЗКИ – *анюціны вочкі.***

***3. Прыпынак «Лясны масіў»***

**Куратар прыпынка:** Добры дзень, шаноўныя! Мой прыпынак называецца «Лясны масіў». Скажыце, калі ласка, якія магутныя дрэвы вы ведаеце? *(Дзеці называюць)*. Цудоўна! А ці ведаеце вы, якія дрэвы вельмі шанавалі нашы продкі і якія дрэвы маюць важнае значэнне ў культуры беларусаў? *(Дзеці адказваюць).* Так, добра! Малайчынкі!

Хлопчыкі і дзяўчаткі, багі падрыхтавалі для вас вельмі цікавае заданне. Вось вы бачыце чароўную скрыню. Там знаходзяцца розныя лясныя прадметы, але вы іх не бачыце. Вам трэба памацаць іх (навобмацак) і адгадаць што там знаходзіцца. Пачынаем!

*Дзеці пад кіраўніцтвам куратара выконваюць заданне.*
*((Прадметы, якія ёсць у скрыні: травінка, грыб, хваёвая галінка, камень, кветкі, палкі, пер'е).*

***4. Прытынак «Птушыны свет»***

**Куратар прыпынка:** Вітаю вас, дзеткі! Мы з вамі знаходзімся на прыпынку «Птушыны свет». Скажыце, калі ласка, якіх птушак вы ведаеце? *(Дзеці адказваюць).* Вельмі добра! Птушкі ў Беларусі маюць асаблівы сакральны сэнс. Яны для нашай краіны – самая сапраўдная спадчына! Старажытныя багі на маім прыпынку вельмі хочуць праверыць, як вы ведавеце птушіны свет. Але не ўсё так проста. Ўсе назвы птушак перablытаны, вам трэба замест пераблытаных назваў запісаць сапраўдныя.

*Дзеці выконваюць заданне пад кіраўніцтвам куратара.*

Адказы на заданне (на рускай мове): **АИСТ, ВОРОБЕЙ, КУКУШКА, СОВА, УДОД, ЛАСТОЧКА, СОЛОВЕЙ, ЦАПЛЯ, ГУСЬ, ЖАВОРОНОК, ИВОЛГА, ТРЯСОГУЗКА, ГОГОЛЬ, ШЕГОЛ.**

Табліца для заняння:

| ***Запутанное название птицы*** | ***Ответ*** |
|---|---|
| **1. ТАИС** | |
| **2. ВОБЕЙРО** | |
| **3. УШКУКАК** | |
| **4. ВАСО** | |
| **5. ОДУД** | |
| **6. ТОЧКАЛАС** | |
| **7. ВЕЙЛОСО** | |
| **8. ПЛЯЦА** | |
| **9. СЬГУ** | |
| **10.РИЖСТ** | |
| **11.ЖАРОНОКВО** | |
| **12.ИЛГАВО** | |
| **13.ТРЯГУЗКАСО** | |
| **14.ГОЛЬГО** | |
| **15.ГОЛЩЕ** | |

***5. Прыпынак «Беларускі арнамент»***

Добры дзень, даражэнькія! Мой прыпынак называецца «Беларускі арнамент». Скажыце, калі ласка, што вы ведаеце пра арнамент? *(Дзеці адказваюць)*. Вельмі добра, сапраўды так! Беларускі арнамент мае вялікі і сакральны сэнс. Гэта асаблівы шыфр нашага народа, элементы якога сімвалізуюць прыгажосць і дабро, даюць надзею і сілу, увасабляюць любоў і павагу да роднай зямлі і сваіх продкаў. Да таго ж арнамент – гэта абярэг прыроды і ўсяго жывога. Вось і заданне ад старажытных багоў. Зараз вам трэба скласці беларускі нацыянальны касцюм, і апрануць аднаго з вашых сяброў.

*Дзеці выконваюць заданне пад кіраўніцтвам куратара.*

***6. Прыпынак «Песні»***

Добры дзень, сябры. Старажытныя багі вельмі хочуць праверыць, як вы ведаеце песні пра жывёл і прыроду. Спяваць вы іх можаце на рускай мове, але апісанне вы будзеце чуць на нашай роднай беларусскай мове.

1) Гэта песня прысвечана аднаму з самых старажытных нацыянальных паркаў Еўропы, які знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі і Польшчы. Векавы лес, які захаваўся тут у першародным выглядзе, знаходзіцца пад аховай ужо каля 600 гадоў і штогод прыцягвае тысячы турыстаў-экааматараў. А візітоўкай гэтай ахоўнай тэрыторыі і неафіцыйным сімвалам Беларусі спрадвеку з’яўляецца зубр. **(Адказ: песня «Беловежская пуща»).**

**Песня «Беловежская пуща»**

Заповедный напев, заповедная даль,
Свет хрустальной зари, свет, над миром встающий,
Мне понятна твоя вековая печаль,
Беловежская пуща, Беловежская пуща

Здесь забытый давно наш родительский кров.
И, услышав порой голос предков зовущий,
Серой птицей лесной из далёких веков
Я к тебе прилетаю, Беловежская пуща…

2) Н
аўрад ці ёсць людзі, якія б не бачылі гэтую зялёную кузурку, якая цвыркае летам у траве. **(Адказ: песня «В траве сидел кузнечик»).**

**Песня «В траве сидел кузнечик»**

В траве сидел кузнечик, в траве сидел кузнечик,
Совсем как огуречик зелёненький он был.
Представьте себе, представьте себе
Совсем как огуречик
Представьте себе, представьте себе
Зелёненький он был!

Он ел одну лишь травку, он ел одну лишь травку,
Не трогал и козявку и с мухами дружил.
Представьте себе, представьте себе
Не трогал и козявку!
Представьте себе, представьте себе
И с мухами дружил!..

3) Д
адзеную песню выконвае незвычайны дуэт Чарапахі і Ільвёнка з мультфільма «Як ільвяня і чарапаха спявалі песню». **(Адказ: песня «Я на солнышке лежу»).**

**Песня «Я на солнышке лежу»**

Я на солнышке лежу,
Я на солнышко гляжу...
Всё лежу и лежу
И на солнышко гляжу.

Носорог-рог-рог идёт,
Крокодил-дил-дил плывёт.
Только я всё лежу
И на солнышко гляжу…

Рядом львёночек лежит
И ушами шевелит,
Только я всё лежу
И на львёнка не гляжу.

4) Гэту песню вы ўсе чулі. Асабліва яе любяць выконваць пад час новага года. Гэта песня пра цудоўнае зялёнае дрэва. **(Адказ: песня «В лесу родилась ёлочка»).**

**Песня «В лесу родилась ёлочка»**

В лесу родилась ёлочка,
В лесу она росла.
Зимой и летом стройная,
Зелёная была.

Метель ей пела песенку:
«Спи, ёлочка, бай-бай!».
Мороз снежком укутывал:
«Смотри, не замерзай!».

Трусишка зайка серенький
Под ёлочкой скакал.
Порою волк, сердитый волк,
Рысцою пробегал…

***7. Прыпынак «Ратуем ад смецця»***

Вітаю вас, дзеткі! Вы трапілі на прыпынак «Ратуем ад смецця». І нам трэба зберагчы нашу родную прыроду і выратаваць яе ад смецця. Багі ўпэўняцца, што вы вельмі добрыя і сумленыя людзі. Вось вы бачыце дзве сметніцы. А непадалёк ад нашага прыпынка раскідана папера. Вам трэба знайсці, сабраць яго і кінуць у сметніцу. Кожны з вас бярэ на адной паперцы і нася да мене. Гатовыя? Тады пачынаем!

*Заданне выконваецца пад кіраўніцтвам куратара прыпынка.*

***8. Прыпынак «Кузуркі»***

Прывітанне, сябры! Як вы лічыце, ці патрыбны для экалогіі кузуркі? На рускай мове гэта «насекомые». *(Дзеці адказваюць).* Правільна, кузуркі маюць

вельмі важнае значэнне: яны сочаць за глебай, дрэвамі і гэтак далей. А зараз вам трэба кожнаму па чарзе назваць якую-небудзь кузурку, можна на рускай мове. Хто затрымаецца больш чым на тры секунды, той выбывае з гульні. Гуляем да таго часу, пакуль не застанецца адзін чалавек.

*Заданне выконваецца пад кіраўніцтвам куратара прыпынка.*

*Пасля праходжання квэста кожная каманда вяртаецца да Васілінкі. Дзеці складаюць сімвалы, якія атрымалі на прыпынках. Васілінка расказвае, што гэтыя сімвалы – беларускі арнамент, які увасабляе самую моцную энергію і мае старажытны сакральны і засцерагальны сэнс. Пасля размовы дзеці вучаць з Васілінкай старажытную замову-заклік. На гэтым Васілінка дзякуе дзецям і развітваецца з імі.*